***М. А. Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар*

# СТОГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ЯК ВАЖНЕЙШЫ ЭТАП ЯЕ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ

Вайна 1914–1918 гг. стала першай у гісторыі чалавецтва, у падзеях якой прымалі ўдзел мільёны маладых мужчын, таму гэтую вайну яшчэ называюць «бітвай салдат». Іх адарвалі ад сахі і станка, на замену ім прыйшлі жанчыны і падлеткі. Безумоўна, тыя, хто стаяў у вытокаў вайны, не ўяўлялі аб яе жудасных наступствах.

За 100 год, якія прайшлі з пачатку Першай сусветнай вайны, змены ў ацэнцы яе падзей, прычын і вынікаў адлюстроўваюць розныя падыходы да гэтых праблем. Адзначым, што для краін Заходняй Еўропы яна заўсёды заставалася больш страшнай трагедыяй, чым Другая сусветная вайна, яе знакавыя падзеі заўсёды шырока адзначаліся грамадскасцю. Як знак прымірэння разглядаўся еўрапейскай грамадскасцю сімвалічны поціск рук паміж канцлерам Германіі і прэзідэнтам Францыі ў 1986 г. каля помніка загінуўшым у гады Першай сусветнай вайны ў раёне Вэрдэна.

У СССР адносіны да Першай сусветнай вайны былі ў пэўным сэнсе дваістымі. Нягледзячы на тое, што ёй прысвячаліся грунтоўныя манаграфіі, абараняліся дысертацыі, аднак даследаванні ў гэтай вобласці заставаліся чыстай навукай. Афіцыйная пазіцыя разглядала вайну 1914–1918 гг. як несправядлівую, імперыялістычную, з лагічным рэвалюцыйным яе заканчэннем. Стваралася ўражанне, што яе ўдзельнікі і ахвяры не мелі ні душы, ні сэрца, не былі маладымі і ахвочымі да жыцця з яго радасцямі і праблемамі.

У постсавецкі перыяд, асабліва на працягу апошніх 10–15-ці гадоў, інтарэс да падзей Першай сусветнай вайны прыкметна актывізаваўся, што знайшло свой адбітак у шматлікіх юбілейных публікацыях і канферэнцыях, дакументальных фільмах і г. д. Урэшце ўспомнілі і аб загінуўшых ахвярах Першай сусветнай вайны. З’явіліся публікацыі, прысвечаныя стану і захаванню воінскіх могілак часоў Першай сусветнай вайны. Напрыклад, да юбілею было прыстасавана адкрыццё ў г. Пінску помніка медыцынскай сястры Рыме Міхайлаўне Івановай. Пад час баёў каля гэтага горада ў верасні 1915 г. яна замяніла загінуўшых афіцэраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



*Мал. 1.*
Грыгорый Мікалаевіч Ракавецкі – удзельнік Першай сусветнай вайны, ураджэнец Беларусі

і ўзначаліла абарону пазіцыі свайго батальёна.

Нельга не заўважыць, што некаторыя даследчыкі імкнуцца засяродзіць увагу на станоўчых момантах у паводзінах людзей, ад якіх залежала – быць вайне ці не. У многіх сучасных публікацыях падкрэсліваюцца высокія асобасныя якасці Мікалая II як сем'яніна і чалавека, арыстакратызм і глыбокая рэлігійнасць галоўнакамандуючага вялікага князя Мікалая Мікалаевіча і інш. Аднак усім відавочна, што гэтыя станоўчыя рысы характару адмоўна сказваліся на выніках і наступствах вайны, таму што ні адзін, ні другі не вызначаліся ваенна-стратэгічнымі талентамі. Такім чынам, ацэнка падзей і ўдзельнікаў Першай сусветнай вайны на працягу 100 год паступова змянілася.

Мы добра засвоілі яшчэ са школы, што вайне папярэднічалі шматлікія лакальныя ваенныя канфлікты, якія распачаліся з канца XIX ст., аднак раўнавага трымалася, нягледзячы на стварэнне двух варагуючых ваенна-палітычных блокаў – Антанты і Траістага саюза. Паказальна, што ў 1913 г. немцы, аўстрыйцы, рускія, якія ў вайне з Напалеонам былі саюзнікамі, урачыста адзначылі стогадовы юбілей сваёй перамогі над французамі ў «бітве народаў» пад Лейпцыгам, хаця ў армейскіх штабах кожнай з гэтых краін ужо існавалі планы будучай вайны, у якой яны выступілі патэнцыяльнымі праціўнікамі.

Сярод некаторых колаў еўрапейцаў у пачатку XX ст. пашыраліся ідэі стварэння па прыватнай ініцыятыве міжнародных арганізацый у абарону міру. Нават Мікалай II выступіў з заклікам за разбраенне, і па яго ініцыятыве былі праведзены дзве Міжнародныя канферэнцыі, прысвечаныя гэтай праблеме. Аднак большасць еўрапейцаў у той час лічыла пацыфізм амаль што здрадай сваёй радзіме. На самой справе адбывалася так, што ўдзельнікі абодвух блокаў стваралі вялізарныя арсеналы, абучалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прызыўнікоў і г. д. Адчуванне небяспекі вітала ў паветры. Вельмі выразна і прадбачліва аб перадваенных днях напісаў Я. Купала: «…штосьці будзе, штосьці будзе! Штосць трывожны лес і людзі!» І як трапна сказаў адзін з даследчыкаў, «у гэтым катле саперніцтва, страхаў і ненавісці паступова павышаўся ціск» [3, с. 648].

«Кацёл» узарваўся 28 чэрвеня 1914 г., калі ў яго была кінута іскра, што загарэлася пасля забойства наследнага прынца Аўстра-Венгрыі. Аптымісты ў Расіі верылі ў «Вялікую ваенную праграму», якая была распрацавана ў пачатку 1914 г., хаця ў гэты час адзін з царскіх міністраў пісаў, што калі вайна пойдзе дрэнна, то сацыялістычная рэвалюцыя ў самай жахлівай форме будзе непазбежна. У Германіі былі ўпэўнены, што яе перамагчы ніхто не зможа. Ваенная эйфарыя ахапіла не толькі ваенныя колы, але і астатняя Еўропа, па трапнаму выразу Рамэна Ралана, «згубіла ўсялякую мараль». Першапачаткова вайну падтрымалі і жадалі перамогі сваім урадам тыя, хто лічыўся маральным аўтарытэтам сваёй нацыі – знакамітыя літэратары, напрыклад, С. Цвейг, Т. Ман, М. Пруст і інш., лідэры сацыял-дэмакратычных партый, нават такія левырадэкальныя, як К. Лібкнехт. Англійскі паэт Р. Брук пісаў: «Я хачу, каб Германія разбіла Расію на дробныя кусочкі, а потым бы Францыя разбіла Германію. …Францыя і Англія – адзіныя краіны, якія дастойны ўлады. …» [3, с. 660].

Сярод такой хвалі ўсеагульнага патрыятызму антываенныя настроі не адчуваліся. Нават левыя партыі ў Германіі і Францыі і іх дэпутаты ў парламентах на першых парах падтрымлівалі вайну і галасавалі за выдзяленне ваенных крэдытаў. Толькі РСДРП(б) адразу заняла бескампрамісную пазіцыю, аб’явіўшы пачаўшуюся вайну імперыялістычнай і заклікаючы ператварыць яе ў грамадзянскую. Аб’ектыўны ход падзей на працягу вайны ў 1914 – 1918 гг. прывёў да ажыццяўлення праграмы бальшавікоў, якія змаглі аформіць стыхійныя імкненні народа да міру ў зразумелыя ўсім заклікі і рашэнні.

Патрыятычны ўздым ахапіў і многіх землеўласнікаў беларускіх губерняў. Нягледзячы на дастаткова негатыўнае стаўленне да царскіх улад, частае непаразуменне з імі, многія землеўласнікі падпісалі адрас на імя імператара. У ім утрымліваліся спасылкі на падзеі Грунвальдскай бітвы, «перамога ў якой дасягнута аб’яднанымі польска-літоўска-рускімі войскамі і якая спыніла хвалю германізацыі … і стварыла магчымасць славянскім наро-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дам развівацца самастойна. І сёння гэтыя народы таксама маюць права спадзявацца на падобнае развіццё падзей з дазволу Яго Імператарскай Вялікасці пасля перамогі над ворагам» [2, с. 223]. У адказе імператара пацвярджаліся гэтыя спадзяванні.

У ранейшых даследаваннях не звярталася ўвага на адносіны да вайны тых, каму выпадала ісці на фронт. На тэрыторыі Беларусі за гады вайны было мабілізавана прыкладна 800–900 тыс. чалавек, што складала амаль 51 % ад усёй колькасці дарослых мужчын. Праўда, у савецкі перыяд сцвярджалася аб масавых антываенных і антыўрадавых выступленнях сярод прызыўнікоў. Сучасныя даследчыкі даказваюць, што большасць выступленняў не мела антываеннай накіраванасці. Падчас правядзення прызыўных кампаній нярэдкімі былі стыхійныя бунты навабранцаў. Напрыклад, назіраліся пагромы вінных магазінаў, таму што быў уведзены «сухі закон», чым парушалася традыцыя провадаў у армію з застоллем [4, с. 31]. Настроі прызыўнікоў праяўляліся ў рабаванні памешчыцкіх маёнткаў, сядзіб заможных сялян, вінных і харчовых крамаў і складаў. Ужо ў пачатку мабілізацыі мелі месца падробкі дакументаў, самастрэлы, узнікалі падпольныя арганізацыі, якія падраблялі дакументы і бралі за гэта вялікія сумы – ад 300 да 4000 руб. [4, с. 37].

Высновы даследчыкаў пацвярджаюць, што дзве мабілізацыі ў ліпені 1914 г. прайшлі паспяхова, на прызыўныя ўчасткі з’явілася 96 % запасных і ратнікаў. Разам з тым падкрэсліваецца, што сярод сялян не назіралася патрэбнага ўладам патрыятычнага ўздыму. Патрыятызм вяскоўцаў праяўляўся патрыярхальна, на ўзроўні веры ў Бога і непагрэшнасць волі Цара, а не на ўсведамленні неабходнасці адстойвання інтарэсаў сваёй краіны. Ім было зразумела, што вайна пагражае разбурэннем гаспадаркі і сям’і, таму асноўная маса вяскоўцаў «успрымала вайну насцярожана, чакаючы ад яе новых цяжкасцей, а таксама трывог за лёс сваякоў, якія накіроўваліся на фронт. З гэтай прычыны большасць насельніцтва жадала заканчэння вайны як мага хутчэй» [4, с. 46].

Да гэтага можна дадаць, што пераважная частка насельніцтва імперыі і салдат не разумелі ні мэты вайны, ні хто з кім ваяваў і г. д. Выкарыстаем надзвычай выразную вытрымку з твора Я. Купалы, праўда, напісанага ў канцы вайны: «Ці ведаеце, што такое Антанта? Адны кажуць, што гэта наравісты конь, другія – што пудзіла на вераб’ёў, трэція – што гэта такая аркестра, у якой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кожны музыка на свой лад заводзе, а чацвёртыя… Антанта, прымаючы пад увагу, што захварэла на вар'яцыю ад дыпламатыі, тры месяцы таму назад выехала за граніцу на цёплыя воды лячыцца. Цяпер, кажуць, Пангерманія будзе замяняць Антанту, пакуль яна вылечыцца» [5, с. 18].

На наш погляд, не дастаткова вывучана пытанне аб дзейнасці, накіраванай на стварэнне патрыятычнай атмасферы яднання ўсіх слаёў грамадства вакол імператара і арміі для дасягнення перамогі. Мікалай II назваў вайну «Другой Айчыннай вайной», а тагачасная прэса падхапіла гэтую ідэю, праўда, яна не прыжылася. Дзеля дасягнення мэты выкарыстоўваліся ўрачыстыя малебны, распаўсюджванне агітацыйных матэрыялаў у форме лубка, ушанаванне георгіеўскіх кавалераў і іх бацькоў. Напрыклад, 28 ліпеня 1915 г. гарадоцкі павятовы спраўнік паведамляў: «Перад уручэннем крыжа настаяцелем царквы было сказана належнае падзеі слова, а ў агароджы царквы перад народам, дзе быў пастроены атрад стражнікаў, мной таксама было сказана некалькі слоў, якія адносіліся да падзей. Мерапрыемства зрабіла вельмі прыемнае ўражанне, расчуліўшы як маці віноўніка, так і шматлікіх прысутных» [4, с. 78]. Ужо ў гады Першай сусветнай вайны пачаўся патрыятычны рух творчай інтэлігенцыі, які праявіўся ў выступленнях перад салдатамі. Да яго далучыліся Ф. Шаляпін, Л. Собінаў, А. Вярцінскі, Н. Плявіцкая і інш.

Сучасная інтэрпрэтацыя падзей Першай сусветнай вайны, асабліва ў сродках масавай інфармацыі, асноўную ўвагу засяроджвае на гераізме салдат і афіцэраў расійскай арміі, абыходзячы многія праблемы, у тым ліку і важнейшую – узаемадзеянне арміі і тылу. У савецкай літаратуры было шмат напісана па гэтай праблеме і было даказана, што забеспячэнне арміі ўсім неабходным аказалася нездавальняючым. Напрыклад, бамбардзір аднаго з артбатальёнаў Заходняга фронту пісаў: «Недахоп ваеннага прыпасу, мала зброі, правіянту, фуражу. Людзей удвая больш, чым у германцаў, але зброі няма. Навабранцы займаюцца з палкамі за недахопам ружжаў…. Смех і сорам, што наша Расія такая вялікая і такая бедная… Генералы падбадзёрваюць, што наша возьме, але, напэўна, гэта няпраўда» [4, с. 72]. Згодна даным у канцы 1914 г. выпускалі 35 тыс. снарадаў у месяц, а для фронту трэба было 45 тыс. у дзень [4, с. 71]. У 1915 г. у некаторых тылавых і запасных часцях салдаты не мелі нават ботаў і хадзілі ў лапцях. Праблема вырашалася ў ходзе вайны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хацелася б акрэсліць і праблему франтавога быту, таму што вайна набыла зацяжны пазіцыйны характар, ператварылася ў «акопную» вайну, што вымагала пошук нейкіх мэтанакіраваных заняткаў для салдат. Згодна ўспамінам асноўным заняткам была гульня ў карты, харавыя спевы, самадзейныя аркестры і тэатр.

Як адна з жудасных характарыстык Першай сусветнай вайны газавая атака разглядалася ў літаратуры даўно, аднак галоўным вобразам у дачыненні да Заходняга фронту. Дзякуючы даследаванням падзей гэтай вайны на тэрыторыі Беларусі, сталі вядомы факты ўжывання газаў і на расійска-германскім фронце. Першыя газавыя атакі адбыліся ў чэрвені – ліпені 1916 г. у раёне Смаргоні і Крэва. Падпаручык М. Зошчанка, будучы пісьменнік, сведчыў: «…в бинокль гляжу в сторону немцев. Теперь я вижу, как они из баллонов выпускают газ. Это зрелище отвратительно. Бешенство охватывает меня, когда я вижу, как методически и хладнокровно они это делают…. Я слышу звуки рожка в немецких окопах. Это отравители играют отбой» [1, с. 178].

У сучасных даследаваннях знайшлі адбітак і іншыя моманты Першай сусветнай вайны, напрыклад узровень медыцынскай дапамогі, роля авіяцыі ў баявых дзеяннях; адлюстравана палітыка нямецкіх акупацыйных улад; ёсць цікавыя работы аб прычынах і наступствах такой з’явы, як бежанства і інш. Кожны з адзначаных кірункаў даследаванняў дазваляе ўнесці новыя звесткі, раскрыць малавядомыя старонкі ў гісторыі Першай сусветнай вайны, інтэрпрэціраваць яе вялікую трагедыю народа з надзвычай складанымі наступствамі.

1. *Белявина, В. Н.* Беларусь в годы Первой мировой войны / В. Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 398 с.

2. *Войнилович, Э.* Воспоминания / Э. Войнилович. – Минск : Издание Минской римско-католич. параф. св. Симона и Елены, 2007. – 380 с.

3. *Дэвис, Н.* История Европы / Н. Дэвис ; пер. с англ. Т. Б. Менской. – М. : АСТ : Транзиткнига, 2004. – 943 с.

4. *Зябко, А. А.* Антываенны рух на тэрыторыі Беларусі (ліпень 1914 – люты 1917 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. А. Зябко. – Мінск, 2013. – 153 с.

5. *Купала, Я.* Антанта / Я. Купала // Спадчына. – 1990. – № 2. – С. 18–19.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ